# Заспяваем разам народную песню



**ГРАМОВІЧ Ірына Міхайлаўна** – кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускай народнапесеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

Мастацтва народных спеваў – спецыфічная і унікальная з'ява ў сучасным музычным выканальніцтве. Яго развіццё залежыць ад зацікаўленасці ў сваёй спадчыне, сваіх каранях, сваіх традыцыях. На жаль, знікаюць не толькі творы фальклору, але і ўзоры стыляў іх выканаўцаў. Рэканструкцыя народных спеваў на сучасным этапе адбываецца дзякуючы творчай дзейнасці фальклорных калектываў. Пераймание імі выканальніцкай манеры, стылёвых і моўных асаблівасцей дапамагае захаваць народнапесенныя традыцыі Беларусі.

Збіральнікі фальклору мала ўвагі звярталі на вакальна-тэхнічныя асаблівасці выканання песні. У лепшым выпадку яны апісвалі жанр, характар выканання, тэмп. Па гэтых даследаваннях складана ўявіць характар гукаўтварэння і гукавядзення, асаблівасці тэмбру і голасу, а таксама тэхніку выканання гукавых прыёмаў, якую ўжывалі носьбіты народнапесенных традыцый.

Беларуская спеўная традыцыя складвалася стагоддзямі і прадстаўляла сабой асобы мастацкі стыль. Зразумець яго магчыма было толькі шляхам глыбокага "ўжывання" ў сэнс народнай песні, у яе эмацыянальны стан і духоўную атмасферу. Перадача песень з пакалення ў пакаленне адбывалася дзякуючы далучэнню дзяцей да народнапесенных традыцый бацькоў. Вядомы фальклараст і збіральніца беларускага народнапесеннага фальклору З.Я. Мажэйка адзначае: "Стыхійнае музычнае выхаванне вясковага народнага спевака пачынаецца з дзяцінства, калі ён слухае калыханкі ( "ката", "люляшы", " калыханкі") бабулі ці маці"[1].

Ва ўмовах адраджэння нацыянальнай спадчыны адным з напрамкаў дзейнасці музычных навучальных устаноў з'яўляецца стварэнне фальклорных гуртоў і далучэнне да гэтага працэсу падрастаючага пакалення. Стыхійнасць пераймання пеcеннага фальклору павінна замяняцца мэтанакіраванай працай па фарміраванні і выхаванні ў падлеткаў рыс музыканта, спевака, творчай асобы, захопленай народным мастацтвам. Для вырашэння гэтай задачы кіраўнік павінен сам добра ведаць усе правілы народнай манеры спеваў, умець растлумачыць навучэнцу прыёмы ўтварэння гуку і выправіць памылкі пры няправільным гукаўтварэнні. Немагчыма абысціся без асэнсавання вакальна-тэхнічнага боку выканання народнай песні на працягу ўсяго навучальнага працэсу. Песенныя навыкі і праца над іх удасканаленнем з'яўляюцца галоўнымі элементамі авалодвання і захавання асаблівасцей народнапесеннага выканальніцтва.

**У вучэбнай рабоце па засваенні народнапесенных традыцый можна вылучыць наступныя этапы:**

- **вучэбна-арганізацыйны, які ўключае падбор рэпертуару, планаванне яго вывучэння і рэпетыцый;**
- **вучэбна-пазнавальны, які прадугледжвае вывучэнне традыцый рэгіянальнай манеры выканання, асаблівасцей стыляў, праслухоўванне запісаў, зробленых у фальклорных экспедыцыях;**
- **вучэбна-творчы, які звязаны з працай над вакальнай тэхнікай і мастацкім вобразам, удасканаленнем акцёрскага майстэрства, фарміраваннем творчай асобы выканаўца.**

Гэтыя этапы цесна звязаны паміж сабою. Кіраўнік групы – хормайстар, які валодае методыкай навучання — праводзіць заняткі на падставе навуковых ведаў. Вакальную работу ён праводзіць з групай навучэнцаў і паасобку, індывідуальна. Заняткі па пастаноўцы голасу, якія абавязкова вядуцца паралельна з заняткамі фальклорнага гурту, з'яўляюцца падмуркам для вывучэння прыёмаў народнапесеннага выканальніцтва, рэгіянальных асаблівасцей спеваў і для авалодвання імі.

Вакальна-харавая работа ў дзіцячым фальклорным калектыве мае сваю спецыфіку. Тут улічваюцца псіхафізіялагічныя асаблівасці ўзроставых груп і рысы голасаўтварэння. Лепшы вынік дае работа з гуртам, у якім дзеці займаюцца з самага дзяцінства. Рэгулярныя заняткі дапамагаюць захаваць вакальныя навыкі і ўменні, а таксама любоў да народных спеваў на ўсё жыццё.

Дзіцячыя галасы адрозніваюцца лёгкасцю, гучнасцю і празрыстасцю. Характэрныя якасці голасу пачынаюць фарміравацца ва ўзросце 7—9 гадоў, калі ў аснове дыяпазону ляжаць прымарныя зоны. У гэты час механізм голасаўтварэння ў хлопчыкаў і дзяўчынак аднолькавы. У 11—13 гадоў надыходзіць перадмутацыйны перыяд. У хлопчыкаў вызначаюцца прыметы груднога рэзаніравання. 13—15 гадоў – мутацыйны (пераходны) перыяд, калі голас мяняе свае якасці. Працягласць мутацыі розная і лягчэй праходзіць у тых дзяцей, якія спявалі да гэтага перыяду. Задача кіраўніка – сачыць за галасамі дзяцей і своечасова пераводзіць у іншую галасавую партыю.

Навучанне народнапесеннаму выканальніцтву падлеткаў прадугледжвае некалькі кірункаў.

**Па-першае, гэта засваенне манеры народных спеваў і агульных прымет традыцыйнага гукаўтварэння.** Тэарэтычныя заняткі прадугледжваюць знаёмства з будовай галасавога апарату, вызначэнне яго ролі ў час спеваў народнай песні. На практычных занятках тэарэтычныя веды замацоўваюцца спецыяльнымі практыкаваннямі.

**Па-другое, гэта авалодванне песеннымі стылямі розных рэгіёнаў Беларусі (Паазер'я, Гомельскага і Брэсцкага Палесся, Цэнтральнага рэгіёна, Панямоння, Падняпроўя).** Заўважым, што гэты працэс павінен прадугледжваць тэматычную накіраванасць і сістэмны падыход. На кожным этапе навучання ставяцца адпаведныя задачы і складаецца спецыяльны план работы. На пачатковым этапе замацоўваюцца правільная спеўная пастаноўка і тэхніка дыхання, навучэнцы авалодваюць спосабам адкрытага народнага гукаўтварэння. У самым пачатку работы вызначаюцца тэмбр і якасць голасу, музычныя і артыстычныя здольнасці спевака, яго творчыя магчымасці і схільнасць да пэўнага жанру. Паступова развіваюцца навыкі народных спеваў: плаўнае і роўнае гукавядзенне, грудное рэзаніраванне, чыстае інтанаванне, правільная артыкуляцыя і дакладная дыкцыя.

На наступным этапе навучання плануецца авалодванне рэгістравымі пераходамі і паступовае пашырэнне дыяпазону. Кіраўнік павінен уважліва ставіцца да магчымасцей галасоў сваіх навучэнцаў і не ўскладняць заданні тым спевакам, у якіх працягваецца мутацыйны перыяд.

Далейшае навучанне накіравана на замацаванне навыкаў і ўменняў вакальнай тэхнікі, атрыманых раней. Асаблівая ўвага надаецца выраўніванню голасу на працягу ўсяго дыяпазону, развіццю гібкасці і рухомасці гукавядзення. Прапануюцца практыкаванні на вялікія скачкі як у павольных, так і ў хуткіх тэмпах уверх і ўніз. Засвойваюцца рэгіянальныя стылі з іх народна-выканальніцкімі прыёмамі. У рэпертуар уключаюцца песні розных абласцей Беларусі з найбольш характэрнымі адметнасцямі гаворкі і мелодыі (з рознымі ўпрыгожваннямі, "народнымі мелізмамі", фаршлагамі, глісандзіраванымі канчаткамі фраз і інш.).

Гуртавыя спевы — гэта непасрэднае авалодванне народнапесеннай традыцыяй з улікам усіх асаблівасцей. Засваенне гэтых асаблівасцей звязана перш-наперш з вывучэннем **жанраў** народных песень і засваеннем на практыцы прынцыпаў іх выканання, а таксама з авалодваннем **дыялектнымі нюансамі мовы** твораў, якія вывучаюцца. Вывучэнне спецыфічных выканальніцкіх прыёмаў вядзе да набыцця вакальна-тэхнічнага майстэрства выкарыстання голасу для перадачы спецыфічнага каларыту і меладычнай афарбоўкі беларускай народнай песні.

Паспяховае выкананне народных песень немагчыма без самастойнай работы выканаўцаў. Невыпадкова вядомы педагог К.Дз.Ушынскі галоўнае месца ў выхаванні чалавека адводзіў самастойнай рабоце. Ён падкрэсліваў, што "самастойная дзейнасць тычыцца ўсіх псіхічных функцый чалавека: увагі, памяці, фантазіі, мыслення, пачуцця, волі" – і што "асоба мае вялікія рэсурсы для развіцця ў ёй актыўнасці і самастойнасці"[2]. У выніку самастойнай работы адбываецца складаны разумовы працэс, дзякуючы якому ствараецца тонкая дыферэнцыяцыя музычна-вакальных уяўленняў, назапашваецца вакальны вопыт, развіваецца логіка музычнага мыслення.

Узнаўленне таго, што вывучаецца на занятках гурту, пашырае і дысцыплінуе памяць, удасканальвае адчуванні, звязаныя са стварэннем правільнага гучання голасу, яго тэхналогіі, а таксама выхоўвае творчы падыход і ініцыятыву. Пры выкананні дамашняга задання, якое заключаецца ў вывучэнні і паўтарэнні сваёй галасавой партыі, падлетак сам адзначае якасць і колькасць выкананай работы і ступень яе завершанасці. Ідэальным варыянтам у самастойнай рабоце над фальклорным матэрыялам лічыцца такі,

калі "пры дапамозе ўскладнення практыкаванняў атрымліваецца паступовы пераход ад ілюстрацыйна-рэпрадуктыўнай формы, звязанай з запамінаннем, усведамленнем, узнаўленнем, практычным ужываннем і замацаваннем навыкаў, засвоеных на занятках, да творчай"[3].

Педагог у працэсе навучання падлеткаў народнай манеры спеваў абапіраецца на агульнадыдактычныя і спецыяльныя прынцыпы. У гэтым артыкуле мы ахарактарызуем найбольш значныя з іх.

**Прынцып развіцця галасавых здольнасцей** (рост выканальніцкіх магчымасцей). Ён рэалізуецца пры ўмовах, калі кіраўнік мэтанакіравана дзейнічае па плану:

а) пастаноўка дыхання і праца над ім;

б) рух ад простых да складаных практыкаванняў;

в) праца над дыкцыяй;

г) паступовае пашырэнне дыяпазону і ўдасканаленне (па магчымасці) вакальнай тэхнікі;

д) праца над вакальнымі прыёмамі народнай песні;

е) праца над адзінай манерай спеваў.

Вядомы выкладчык Дз.Я.Агароднаў адзначаў: "... мэтанакіраванае развіццё голасу садзейнічае паўнацэннаму развіццю ўсіх іншых музыкальных здольнасцей навучэнцаў"[4]. Натуральнае, свабоднае гукаўтварэнне выяўляе ўсе індывідуальныя якасці голасу і яго тэмбравую прыгажосць. Кіраўнік працуе ў межах магчымасцей галасоў сваіх навучэнцаў, пазбягаючы фарсіроўкі і напружанасці гучання.

**Прынцып адзінства тэхнічнага і мастацкага развіцця спеваў.** Важна ведаць, які́м павінен быць правільны гук, умець яго ўзнавіць. Засваенне складаных, рытмічна разнастайных народных твораў немагчыма без авалодвання вакальна-тэхнічнымі навыкамі. Пераход ад простага да складанага, ад лёгкага да цяжкага пры фарміраванні спеўных навыкаў і засваенні вучэбнага матэрыялу вядзе да набыцця вакальнага майстэрства. Вакальна-тэхнічныя навыкі садзейнічаюць фарміраванню творчага ўяўлення, мастацкага густу і дапамагаюць на добрым узроўні зрабіць мастацкую апрацоўку твора, які выконваецца. Рэалізацыя гэтага прынцыпу вядзе да набыцця навыкаў асэнсаваных выразных спеваў.

**Прынцып слыхавога ўспрымання і пераймання народнай манеры спеваў.** Гэты прынцып заснаваны на асабістых, суб'ектыўных адчуваннях у час праслухоўвання запісаў фальклорнага матэрыялу, а таксама ў час слухання хормайстра. Падлетак дае ацэнку пачутага і імкнецца на практыцы прадэманстраваць тое, што запомніў. Узнаўленне пачутага характарызуецца імкненнем перадаць гучанне песні, абагульняючы перш-наперш вакальна-слыхавыя ўяўленні, сфарміраваныя спеўныя навыкі і ўменні кіраваць сваім голасаўтваральным апаратам. Музычная памяць, увага, вакальны слых у працэсе навучання ўзаемадзейнічаюць з вакальна-слыхавымі ўяўленнямі. Пасля аднаразовага праслухоўвання фоназапісу цяжка адразу ўзнавіць гучанне твора. Пры паўторным праслухоўванні магчымасці ўдасканалення песеннай дзейнасці павялічваюцца.

Узор народнага твора можа і не з'яўляцца эталонам вакальнага выканання, але для навучэнца важна пераняць асаблівасці манеры выканання песні, меладычны малюнак, упрыгожванні, стылёвыя асаблівасці і інш.

**Прынцып бесперапыннага навучання і творчай актыўнасці.** Бесперапынныя заняткі па авалодванні вакальнымі навыкамі дазваляюць стварыць сістэму ў навучанні. Дзякуючы рэгулярным заняткам па пастаноўцы голасу і рэпетыцыям фальклорнага гурту адбываецца пастаянная трэніроўка галасавога апарату, паўнацэннае развіццё голасу і фарміраванне песеннага стэрэатыпу. Творчая актыўнасць дапамагае пераадолець цяжкасці засваення народнай манеры спеваў. Гэты прынцып фарміруе інтарэс да народнапесеннага мастацтва, а таксама дапамагае ўменню творча падыходзіць да выканання твора на сцэне.

**Прынцып паслядоўнасці ў навучанні.** Гэты прынцып прадугледжвае паступовы рух ад тэарэтычна-абгрунтаваных ведаў да практычных заняткаў, ад простых практыкаванняў на зручных тонах голасу да складаных з мэтай развіцця магчымасцей голасу падлетка. Ён рэалізуецца на працягу ўсяго навучання.

**Прынцып індывідуальнага характару навучання.** Індывідуальны характар навучання абумоўлены тым, што кожны чалавек ад прыроды надзелены спецыфічнымі галасавымі якасцямі і музыкальнымі здольнасцямі. Менавіта таму, прытрымліваючыся гэтага прынцыпу, кіраўнік мае магчымасць выкарыстоўваць мноства розных метадаў і прыёмаў навучання для дасягнення эфектыўнасці ў набыцці вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў.

**Прынцып творчага развіцця асобы падлетка і зацікаўленасці ў народнапесенным мастацтве.** Фарміраванне спевака як творчай і ўсебакова развітой асобы вядзецца ўжо з самага пачатку навучання. Задача рэалізацыі гэтага прынцыпу — аб'яднаць усе папярэднія прынцыпы ў адзін, што дазволіць выхаваць падлетка як зацікаўленую і ўлюбёную ў народнае мастацтва асобу з веданнем традыцыі выканання беларускай народнай песні. Фарміраванне творчай асобы немагчыма без развіцця творчага мыслення навучэнца. Выкладчык пераконвае падлетка шукаць свой варыянт увасаблення народнай песні. Сюды ўключаецца праца над нюансамі, гукавымі ўпрыгожваннямі, а таксама над словам і раскрыццём вобраза песні.

**У працэсе навучання падлетку прапануюцца наступныя заданні, з дапамогай якіх ён зможа праявіць сябе:**

- па-мастацку аформіць народную песню, расставіць цэзуры, лагічныя націскі, прадумаць дынамічныя адценні і інш.;
- знайсці спецыяльныя рухі для песні танцавальнага характару, а таксама жэсты для песень лірычных і жартоўных;
- прадумаць вобразнае вырашэнне народнай песні для раскрыцця сюжэтнай лініі;
- раскрыць свае акцёрскія здольнасці і выканаць песню "ў ролях".

Авалодванне народнапесеннымі традыцыямі павінна трывала ўвайсці ў сістэму музычнага навучання і выхавання падлеткаў. Чым больш глыбока кіраўнік будзе валодаць усімі неабходнымі педагагічнымі прынцыпамі па навучанні і захаванні народнапесенных традыцый у фальклорных калектывах, тым больш эфектыўным будзе працэс навучання і далучэння падлеткаў да народнага мастацтва.

---

[1] Можейко З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования. Мн., 1985. С. 66.

[2] Ушинский К. Д. Собр. соч.: В 10 т. Т. 2. М.-Л., 1948. С. 226.

[3] Менабени А.Г. Самостоятельная работа студента при обучении сольному народному пению // Вопросы вокальной педагогики. М., 1976. С. 248.

[4] Огороднов Д.Е. Воспитание певца в самодеятельном ансамбле. Киев, 1980. С. 7.

***Факультет дошкольного образования БГПУ им. Максима Танка отметил свое 25-летие со дня основания.***

***Редакция журнала сердечно поздравляет юбиляров и желает творческого долголетия, высоких научных достижений, успехов в подготовке педагогических кадров для дошкольного образования Беларуси.***

***Представляем гостью рубрики — декана факультета дошкольного образования Ирину Владимировну Житко. Значительную часть своих научных разработок И.В.Житко посвятила проблеме педагогической диагностики — неотъемлемой части образовательного процесса.***

***Предлагаемая вашему вниманию статья И.В.Житко продолжает ряд публикаций по проблеме педагогической диагностики. В последующих материалах будет дан анализ научных подходов к постановке цели, выбору показателей и критериев их оценки, методов и процедуры педагогической диагностики.***



**ЖИТКО Ирина Владимировна** – декан факультета дошкольного образования БГПУ им. Максима Танка, кандидат педагогических наук, доцент

Реализация в функционировании и развитии системы дошкольного образования принципов гуманизации, природосообразности, развития ребенка в деятельности и демократизации воспитания актуализируют формирование таких качеств специалистов дошкольных учреждений, как готовность реагировать на социальный запрос, происходящие изменения, прогнозировать будущую ситуацию, строить и перестраивать свои действия согласно современной парадигме образования.

Как для системы образования Республики Беларусь в целом, так и для ее первого уровня — дошкольного образования — характерны общесистемные изменения, что ведет за собой постановку иных целей и задач: создать условия для формирования свободной функциональной личности. Важно вовремя увидеть, правильно оценить, проследить этот процесс, заметить проблемы как можно раньше, наметить программы их устранения, коррекции развития, профилактики возможных нежелательных явлений. Эту потребность педагогического процесса реализует диагностика.

Выделение педагогической диагностики в специальный предмет изучения обусловлено не только ее значимостью как аспекта исследовательской деятельности педагога, но и определяющей ролью в научной организации педагогического процесса, т.е. зависимостью успеха обучения от объективной оценки его результата, учета реального состояния развития личности ребенка, и на этой основе научного планирования образовательной работы.

Главное назначение педагогической диагностики – создание оптимальных усло-